# Падрыхтоўка навуковых кадраў па міжнародных адносінах у саветах па абароне дысертацый (1992–2017 гг.)

**ГУРЫН А. В.**,
*канд. гіст. навук, дац.,*
*Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь*

На рубяжы 1980–1990-х гг. пачаўся якасна новы перыяд у развіцці беларускай грамадска-палітычнай навукі, што было звязана з распадам СССР і станаўленнем незалежнай Рэспублікі Беларусь. Часткай глыбокіх трансфармацыйных працэсаў, якія адбываліся ў беларускай навуцы, стала фарміраванне нацыянальнай школы міжнародных даследаванняў.

Складанне асноўных тэматычных кірункаў школы, метадалагічных падыходаў, кадравага патэнцыялу і структурных адзінак ажыццяўлялася не на пустым месцы. Вывучэнне гісторыі міжнародных адносін і знешнепалітычнай гісторыі Беларусі пачалося яшчэ ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. Аднак доўгі час з-за адсутнасці кадраў і неадпаведнасці міжнароднай праблематыкі асноўным кірункам дзейнасці беларускай гістарычнай навукі — гэтым з'яўлялася вывучэнне «ўнутранай» гісторыі БССР — падраздзяленні Акадэміі навук і БДУ не маглі разгарнуць сваю працу па даследаванні гісторыі міжнародных адносін. Толькі ў пасляваенныя часы ў Беларусі пачалі дзейнічаць цэнтры навуковых даследаванняў адпаведнага профілю. У 1950–1980-х гг. у БССР сфарміраваліся пэўныя традыцыі вывучэння і выкладання гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін. Гэтыя традыцыі развіваліся ў межах двух галоўных цэнтраў адукацыі і навукі рэспублікі — Белдзяржуніверсітэта і Акадэміі навук.

Становішча на «фронце» міжнародных даследаванняў кардынальна змянілася ў 1990-х гг. Разам з ліквідацыяй манаполіі марксісцка-ленінскай метадалогіі і замацаваннем гнасеалагічнага плюралізму ў айчынную гістарычную навуку вярнуліся забароненыя раней імёны, былі зняты абмежаванні на вывучэнне так званых «белых плямаў», пачалі вывучацца новыя тэмы. З'явілася магчымасць фарміравання новых і мадэрнізацыі традыцыйных цэнтраў міжнародных даследаванняў, сталі развівацца сувязі з даследчыкамі замежных, асабліва заходніх, краін. Сучасныя патрабаванні развіцця беларускай навукі, якія грунтуюцца

на новых метадалагічных падыходах, актыўным і творчым успрыманні дасягненняў і вопыту даследаванняў замежных краін, шырокім выкарыстанні новых крыніц і дакументаў, дыктуюць неабходнасць пераасэнсавання і далейшага вывучэння гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін і Беларусі.

Развіццё школы міжнародных даследаванняў, павелічэнне колькасці даследчыкаў і якасці іх прац немагчыма без работы спецыялізаваных саветаў по абароне дысертацый. У савецкі перыяд развіцця навукі міжнародных адносін у Беларусі ў даследчыкаў было няшмат магчымасцей для напісання дысертацый, у першую чаргу доктарскіх, па міжнароднай тэматыцы, паколькі такія даследаванні лічыліся «прэрагатывай Масквы». Таму беларускія навукоўцы маглі абараняць свае працы ў Маскве, Ленінградзе ці арыентаваць свае распрацоўкі ў галіну спецыяльнасцей: «Гісторыя КПСС», «Гісторыя СССР», «Усеагульная гісторыя». Аднак нельга сказаць, што такая сітуацыя дрэнна паспрыяла на развіццё міжнародных даследаванняў у краіне ў свой час. Так, у 1980-х гг. было абаронена 3 доктарскія і 14 кандыдацкіх дысертацый па праблемах гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі замежных краін. Фактычна быў закладзены трывалы падмурак для далейшага развіцця міжнародных даледаванняў у краіне.

Першай у краіне кандыдацкай дысертацыяй, абароненай па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі», стала кандыдацкая дысертацыя А. І. Гардзейчыка (1998 г.) «Палітычныя і эканамічныя ўзаемаадносіны Рэспублікі Беларусь і Расійская Федэрацыі ў першай пал. 1990-х гг.» (на рускай мове). Яна была абаронена ў Савеце па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, створаным на кафедры міжнародных адносін БДУ ў сакавіку 1998 г., — першым у краіне савеце па адпаведнай спецыяльнасці. У снежні 2000 г. у гэтым жа Савеце ўпершыню ў краіне былі паспяхова абаранены доктарскія дысертацыі па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» М. Э. Часноўскім і В. Г. Шадурскім. Усяго ў Савеце з 1998-га па 2005 г. былі абаронены 4 доктарскія і 26 кандыдацкіх дысертацый (прыкладна 4,3 дысертацыі за год).

Спыненне працы Савета, без сумневу, прывяло да скарачэння колькасці абарон — спецыяльнасць «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» была адкрыта для абароны ў савеце БДУ па гістарычных навуках Д.02.05.01, дзе прымаліся да абароны дысертацыі яшчэ па трох

гістарычных спецыяльнасцях, у тым ліку па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя», па якой традыцыйна найбольш абарон. У перыяд з 2006-га па 2017 г. па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» былі абаронены 4 доктарскія і 14 кандыдацкіх дысертацый, прыкладна 1,6 дысертацыі за год.

Акрамя спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі», абарона дысертацый па міжнароднай праблематыцы ажыццяўлялася ў межах спецыяльнасцей «Айчынная гісторыя» і «Усеагульная гісторыя». У перыяд з 1992-га па 2010 г. былі абаронены 4 доктарскія і 34 кандыдацкіх дысертацыі (у сярэднім 2 дысертацыі ў год).

Такім чынам, усяго ў перыяд з 1992-га па 2017 г. па міжнароднай тэматыцы было абаронена 12 доктарскіх і больш за 70 кандыдацкіх дысертацый (прыкладна каля 3,3 дысертацый у год).

Спыненне існавання самастойнага Савета по абароне дысертацый па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі» сур’ёзным чынам сказалася на падрыхтоўцы спецыялістаў-міжнароднікаў вышэйшай кваліфікацыі, выніковасці работы аспірантур у гэтай галіне. Паколькі скарацілася колькасць абарон кандыдацкіх дысертацый, зменшыліся магчымасці фарміравання новых навуковых школ у галіне міжнародных адносін і істотна запаволіўся колькасны рост навуковых школ, якія ўжо існавалі.